Выкарыстанне філасофскіх, агульнанавуковых і спецыяльных метадаў у юрыдычным даследаванні садзейнічае ўдасканальванню нарматыўна-прававой структуры грамадства, верхавенству закона, маральна-гуманістычнаму прадвызначэнню права, яго цеснай сувязі з прававой культурай соцыуму.

1. *Васьковский Е.В.* Цивилистическая методология.— Б.м., б.г.— 398 с.

2. *Витушко В.* Курс гражданского права: общая часть: Науч.-практ. пособие.— Мн., 2001.— Т. 1.— 414 с.

3. *Гульпе А.Н.* Формирование методологии советской правовой науки (1917—1925 гг.): Автореф. дис....канд. юр. наук / Ин-т государства и права АН СССР. — М., 1986. — 16 с.

4. *Казаков В.Б.* Генезис права: вопросы теории: Автореф. дис....канд. юр. наук / ЛГУ. — Л., 1988.— 16 с.

5. *Садовский М.Н.* О философско-методологическом анализе научного прогресса // Философские науки. — 1981. — №5. — С. 11—15.

**А.Я.Вайтусёнак,**
*суіскальнік кафедры харавога мастацтва*

## ВЫТОКІ І МАСТАЦКІЯ ТРАДЫЦЫІ СЛАВЯНСКАЙ ДУХОЎНАЙ МУЗЫКІ

Духоўная музыка — гэта музыка рэлігійнага зместу, якая выконваецца ў храме ці ў канцэртнай зале. У аснове праваслаўнай духоўнай музыкі ляжыць знаменны распеў; аснову каталіцкай музыкі складае грыгарыянскі харал; для лютэранскай музыкі асновай з'яўляецца пратэстанцкі харал.

Музычная супольнасць славян — гэта не маналітная народная музычная культура, а музыка ў дастатковай меры дыферэнцыраваная, у якой знайшлі адбітак традыцыі,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вераванні, абрады, быт славянскіх народаў, але дзе, безумоўна, захаваліся агульнаславянскія рысы.

Паколькі не захавалася помнікаў музычнай культуры славян да прыняцця хрысціянства, даследаванне гэтага пытання вядзецца з IX—X стст. Паўднёвыя славяне (напрыклад, балгары) у выніку тэрытарыяльнай блізкасці да Візантыі больш дакладна прытрымліваліся грэчаскіх традыцый у культавых спевах.

Больш аддаленыя плямёны (напрыклад, заходнія, — чэхі, славакі) маглі адчуваць моцны ўплыў іншых хрысціянізаваных народаў, напрыклад лацінскіх. У царквах Славакіі харалы і духоўныя вакальныя творы выконваліся на лацінскія тэксты яшчэ ў XI ст. Да прыняцця хрысціянства на Русі (988) у царквах склалася структура візантыйскага богаслужэння: яркая дэкаратыўнасць, мнагапланавая драматургія і складанае музычнае суправаджэнне. Усё гэта патрабавала ад святара высокага ўзроўню падрыхтоўкі і пеўчай школы. Асноўнымі выкладчыкамі ў рускіх музыкантаў былі грэкі і балгары. (Балгары прынялі хрысціянства ў 865 г., што, аднак, не прывяло да знікнення язычніцкіх культаў, таксама як і ва ўсходніх славян.) На Русі магчымы ўплыў грэка-ўсходні і сірыйскі (В.М.Металаў). Існуе версія, што рускія разам з прыняццем хрысціянства з Візантыі прынялі і ўсё кола грэчаскіх песнапенняў (з перакладам тэкстаў на славянскую мову), але стварылі пры гэтым свой меладычны стыль, таму што мелодыка-рытмічны рысунак песнапенняў не адпавядаў славянскім тэкстам.

Музыка праваслаўных народаў Усходу (пераважна грэкаў) і славян у адрозненне ад каталіцкай і пратэстанцкай была выключна вакальнай. На працягу амаль двух стагоддзяў візантыйскія формы музычнага мыслення падвяргаліся ўплыву народнага музычнага мастацтва. У выніку з'явіліся новыя жанры культавай музыкі. У старарускай царкоўнай музыцы гэта знаменны распеў, які панаваў аж да XVII ст. і ўяўляў сабой унісонныя мужчынскія спевы. Традыцыі знаменнага распеву захаваліся ў спевах старaабрадцаў да сённяшніх дзён.

У сярэдзіне XVII ст. на Русі распаўсюдзіліся кіеўскі, балгарскі, грэчаскі распевы з характэрным для іх сіметрычным рытмам, дзяленнем на такты аднолькавай працягласці. Распаўсюджвалася таксама і партэснае шматгалоссе, якое выцясняла знаменныя спевы. У царкоўнай музыцы другой паловы XVII ст. узмацніўся уплыў народнай музыкі і кантаў.

У Балгарыі (паўднёвыя славяне) у XIII—XIV стст. фарміруецца так званы "балгарскі распеў", прыклады якога захаваліся ў богаслужэбных спевах рускай праваслаўнай царквы XVII—XVIII стст. Аднак сярод балгарскіх музыказнаўцаў няма адзінства ў поглядзе на балгарскі распеў. З XIV ст. Балгарыя была заваявана туркамі, знішчаліся ўсе праяўленні нацыянальнай культуры, а нацыянальныя царкоўныя спевы выцясняліся грэчаскімі, пеўчыя кнігі знішчаліся. Песнапенні з назвай "балгарскі распеў" сустракаюцца ў заходнеўкраінскіх пеўчых кнігах. Таму некаторыя рускія даследчыкі сцвярджаюць, што ён запазычаны ад прыдунайскіх славян. Па тыпе мелодыкі балгарскі распеў відавочна адрозніваецца ад знаменнага. Для яго характэрны сіметрычнасць руху, танальная устойлівасць напеваў, дакладнае паўтарэнне мелодыі ў некалькіх радках твора, адсутнасць варыяцыйнага развіцця матываў. Як і знаменны распеў, балгарскі падпарадкоўваецца сістэме асмагласся, але па колькасці напевак значна яму ўступае. У XIII—XIV стст. у Балгарыі сфарміравалася нацыянальная царкоўна-пеўчая школа (г. Тырнаў), якая ўплывала на праваслаўную царкоўную музыку іншых краін (у прыватнасці рускую).

Першыя славацкія (заходнія славяне) народныя духоўныя песні паходзяць з XIV ст. Гэта так званыя "гусіцкія песні". (Узніклі ў перыяд дзейнасці Яна Гуса — нацыянальнага героя чэшскага народа, аўтара тэкстаў і мелодый чэшскіх патрыятычных песень.) Гусіцкія песні цесна звязаны з народнай мелодыкай, складаліся ў форме духоўных песнапенняў. У процівагу лацінскім гімнам яны выконваліся на чэшскай мове без інструментальнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

суправаджэння. У адных з іх выяўляюцца элементы старажытначэшскай песеннасці, у некаторых гімнах відавочны ўплыў нямецкіх рэлігійных песнапенняў. У гусіцкіх песнях пераважаюць дыятанічныя лады (дарыйскі, фрыгійскі, лідзійскі, эалійскі). Менавіта гэтыя лады і ўтвораныя ад іх сістэмы ляглі ў аснову культавай музыкі хрысціянскай царквы. Для гусіцкіх песень шматгалоссе не тыпова. Дзякуючы лёгкасці выканання (даступнасць тэксту, невялікі дыяпазон мелодый, адсутнасць каларатурных аздабленняў), яны аказалі вызначальны ўплыў на развіццё чэшскай музыкі аж да канца XVII ст. У XV ст. з Германіі, Польшчы, Італіі і галоўным чынам з Нідэрландаў пранікае культавая поліфанічная музыка. З'яўляюцца першыя аўтары культавай славацкай музыкі. У XIV ст. (пад уплывам ідэй Рэфармацыі) узнікае пазалітургічная духоўная песня на роднай мове. У XVII ст. у культавых творах славацкай музыкі відавочны ўплыў італьянскай і нямецкай музычнай эпохі барока.

Да XVII ст. царква ў славянскіх народаў з'яўлялася галоўным цэнтрам музычнай прафесійнасці. Важнейшыя музычныя жанры фарміраваліся ў рамках царкоўнай культуры. З царквой таксама звязана і развіццё тэорыі музыкі, нотапісу, педагогікі.

З XVIII ст. царкоўная музыка славян падпадае пад уплыў народнай песеннай творчасці, узмацняюцца нацыянальныя тэндэнцыі, з'яўляюцца новыя разнавіднасці партэснай музыкі — духоўныя канты, псалмы, духоўныя канцэрты.

Славянская духоўная музыка, пачаўшыся ад грэка-візантыйскай царквы, злілася з музыкай народнай і нарадзіла самабытны сінтэз. У гэтай музыцы адлюстраваліся і нацыянальны характар славян, і іх гісторыя, і паэтычнасць. Прайшоўшы складаны шлях эвалюцыі ад манадыі старажытных распеваў да маштабных шматгалосных фрэсак новага напрамку, духоўная музыка славян захавала традыцыі старадаўніх царкоўных песнапенняў.



РЭПАЗІТАРЫЙ БГУКІ